Князева Т.Ц.,
канд.гіст.навук,
дацэнт

# ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА "БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ФОНДЫ" І ШЛЯХІ ЯГО ЎДАСКАНАЛЬВАННЯ

Курс "Бібліятэчныя фонды" з'яўляецца адным з вядучых вучэбных бібліятэказнаўчых дысцыплін. Яго вывучэнне -- абавязковае для ўсіх студэнтаў ФІС. Ён забяспечвае прафесійную падрыхтоўку бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі ўсіх спецыялізацый.

Канцэпцыя развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама павышэнне статуса нашай навучальнай установы патрабуюць павышэння запатрабаванняў да выкладання спецыяльных дысцыплін.

У сувязі з гэтымі запатрабаваннямі выкладчыкі ў 1992/93 навучальным годзе распрацавалі новую вучэбную праграму курса "Бібліятэчныя фонды", якая найбольш улічвае спецыфіку развіцця бібліятэчнай справы ў рэспубліцы, адраджэнне беларускай культуры, беларускай мовы.

У 1991 годзе выйшаў з друку і новы вучэбны дапаможнік Ю.Сталярова "Библиотечный фонд", так што маюцца ўсе падставы для паспяховага выкладання і вывучэння дадзенага курса. На яго выкладанне адведзена вучэбным планам на дзённым аддзяленні 92 гадзіны. З іх лекцыйны курс складае 50 гадзін, семінарскія заняткі -- 10, лабараторныя -- 26 гадзін, 4 гадзіны -- самастойная праца студэнтаў. Прадугледжана па 2 гадзіны кансультацый на групу. І заканчваецца вывучэнне курса экзаменам.

Семінарскія заняткі праводзяцца па найбольш складаных тэарэтычных тэмах курса, напрыклад "Функцыі, уласцівасці і прынцыпы фарміравання бібліятэчных фондаў", "Шляхі фарміравання адзінага бібліятэчнага фонду" і інш. Падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў прадугледжвае вывучэнне рэкамендуемай літаратуры, камплектаванне асобных палажэнняў па тэме семінара, падбор ілюстрацыйнага матэрыялу, раскрыццё тэмы на прыкладах з практычнай дзейнасці бібліятэк рэспублікі.

Лабараторныя заняткі дапамагаюць лепш усвядоміць тэхналогію асобных працэсаў фарміравання бібліятэчнага фонду, напрыклад стварэнне даведачнага апарату ў дапамогу камплектаванню, адбор дакументаў у фонд бібліятэкі, улік бібліятэчнага фонду і інш. Яны таксама дапамагаюць выпрацаваць у студэнтаў практычныя навыкі, пазнаёміць з інструктыўна-метадычнымі дакументамі, самастойна аналізаваць сітуацыю, рабіць свае вывады і прапановы, знаёміцца з практыкай бібліятэчнай справы. Гэтае знаёмства пашыраецца і замацоўваецца ў час вытворчай практыкі студэнтаў у канкрэтных бібліятэках.

Але на сённяшні дзень маецца і цэлы шэраг праблем, якія патрэбна вырашаць. Распрацаваная праграма курса на аснове шматгадовага вопыту выкладання ўключае 22 тэмы. У новым вучэбным дапаможніку, выпушчаным з друку ў 1991 г., няма цэлага шэрагу тэм, прадугледжаных у праграме курса. Напрыклад, няма такіх тэм, як "Асаблівасці фарміравання фондаў", "Фарміраванне фондаў бібліятэк розных тыпаў і відаў ва ўмовах аўтаномнай дзейнасці і ў ЦБС", "Бібліятэчныя фонды ў Рэспубліцы Беларусь", "Фарміраванне фондаў бібліятэк за мяжой". Да гэтых тэм распрацаваны спісы літаратуры, чытаюцца лекцыі. Але матэрыял іх успрымаецца студэнтамі з цяжкасцямі.

Для далейшага ўдасканальвання выкладання курса "Бібліятэчныя фонды" патрэбна наступнае:

1. Па ўсіх пералічаных тэмах курса, якія не выкладаюцца ў вучэбным дапаможніку, неабходна, каб былі надрукаваны тэксты лекцый, каб студэнты маглі іх выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў, да экзаменаў.

2. Распрацаваць па ўказаных тэмах тэматыку рэфератаў, дакладаў, курсавых работ.

3. Тэмы курса "Бібліятэчныя фонды ў Рэспубліцы Беларусь" і "Фарміраванне фондаў бібліятэк за мяжой" прапанаваць студэнтам вывучаць самастойна, выкарыстоўваючы для вывучэння першай тэмы вытворчую практыку і вопыт канкрэтных бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Кантроль за самастойным вывучэннем тэм здзяйсняць у выглядзе калёквіўму па 2 гадзіны на студэнцкую групу за кошт запланаванай самастойнай працы студэнтаў.

4. Унесці ў праграму практыкі студэнтаў II курса вывучэнне пытання аб арганізацыі бібліятэчнага фонду ва ўмовах адкрытага доступу, бо гэта тэма не чытаецца.

5. Лабараторныя заняткі на тэму "Расстаноўка бібліятэчнага фонду" пажадана праводзіць

на базе Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, РНТБ і іншых буйных бібліятэк. Але для гэтага патрэбна з боку рэктарата выдзяленне сродкаў для аплаты супрацоўнікам бібліятэк за той час і працу, якія бібліятэчныя работнікі патрацяць на нашых студэнтаў.

Вось тыя, на наш погляд, некаторыя праблемы, якія патрэбна вырашаць для ўдасканальвання выкладання курса "Бібліятэчныя фонды".

Суддзя Э.С.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ КУРСА "БІБЛІЯГРАФІЯ МАСТАЦТВА"

Курс "Бібліяграфія мастацтва" ўзаемазвязаны з шэрагам як папярэдніх, так і паралельна чытаемых наступных курсаў: "Тэорыя бібліяграфіі", "Кнігазнаўства", "Бібліятэчнае абслугоўванне", "Інфарматыка", "Гісторыя мастацтваў" і інш.

Характар узаемасувязі абумоўлены ступеньчатасцю і бесперапыннасцю адукацыі, г.зн. ідэяй лагічнага, канцэптуальнага і іншага паступальнага назапашвання інтэлектуальных ведаў і набыцця практычных навыкаў.

У значнай меры фарміраванню гэтых ведаў і ўменняў садзейнічае вывучэнне студэнтамі інтэграцыйных працэсаў, якія ахопліваюць сёння ўсе галіны чалавечай дзейнасці, асабліва навуку.

У агульнанавуковым курсе "Гісторыя мастацтваў" даюцца прадстаўленні аб сучасных праблемах навук мастацка-эстэтычнага комплексу, але, на жаль, у гісторыка-мастацкім плане, таму курс "Бібліяграфія мастацтва" не можа абапірацца на багаж ведаў, атрыманых студэнтамі ў гэтым курсе. Па характару і задачах лекцыі і лабараторныя заняткі з некаторай доляй умоўнасці можна падзяліць на азнаямленчыя (пазнавальныя), аналітычныя і творчыя (праблемныя).

Лабараторныя заняткі азнаямленчага характару праводзяцца з мэтай замацавання ў памяці, канкрэтызацыі лекцыйнага матэрыялу, што дае магчымасць студэнту спалучыць веды з курса "Гісторыя мастацтваў" аб асобных стылях, жанрах, творчых асобах.

Адной з тэм, якая разглядаецца ў некалькіх курсах, з'яўляецца тэма аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм па культуры і мастацтву. Размежаванне ідзе па лініі апрацоўкі і выкарыстання мастацтвазнаўчай інфармацыі. Заняткі творчага тыпу разумеюцца намі як заняткі, мэта якіх -- стварэнне новай бібліяграфічнай інфармацыі або пераўтварэнне аднаго тыпу інфармацыі ў другі. На гэтым шляху неабходна цесная сувязь з курсамі "Тэорыя бібліяграфіі", "Арганізацыя бібліяграфічнай работы", "Інфарматыка".

Чытанне курса "Гісторыяграфія мастацтвазнаўства" на факультэце завочнага навучання дазваляе сканцэнтраваць увагу студэнтаў на інтэграцыйным характары інфармацыйных патрэб спецыялістаў у галіне мастацтва і суаднесці іх са стратэгіяй бібліяграфічнага пошуку, які раскрываецца ў курсе "Бібліяграфія мастацтва".

Перспектыўным напрамкам у дасягненні пераемнасці ў перадачы ведаў і ўменняў можа стаць выпрацоўка адзінай метадалогіі навучання, канчатковым вынікам якой стане фарміраванне творчай асобы, каштоўнасць якой на рынку працы даволі высокая.

Для атрымання ступені бакалаўра прапануюцца цыклы тэхналагічных дысцыплін, для атрымання ступені магістра -- курсы, якія ставяць мэтаю выпрацоўку навыкаў самастойнай творчасці.

Прапануецца ўвесці матэрыял па бібліяграфічнаму апісанню выданняў па мастацтву ў курсе "Каталагізацыя мастацкай літаратуры і літаратуры па мастацтву"; аднавіць курс "Гісторыяграфія мастацтвазнаўства" на стацыянары; працягваць работу па перадмашыннай апрацоўцы патокаў і масіву па мастацтву для фарміруемай базы даных для ўводу ў вучэбную АІС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ